Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “НАЗОЎНІК.<br>ГРАМАТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ. АСАБЛІВАСЦІ СКЛОНАВЫХ КАНЧАТКАЎ”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2018

## ЗМЕСТ

**І. Тэарэтычны раздзел**

1. Граматычныя катэгорыі назоўніка

1.1. Катэгорыя роду

1.2. Несупадзенне роду некаторых аднакарэнных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах

1.3. Катэгорыя ліку назоўнікаў

1.4. Несупадзенне ліку некаторых аднакарэнных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах

1.5. Катогорыя склону назоўнікаў. Сістэма склонаў у сучаснай беларускай мове

1.6. Асноўныя значэнні склонаў

1.7. Роля прыназоўнікаў пры выражэнні склонавых значэнняў

1.8. Скланенне назоўнікаў. Тыпы скланення назоўнікаў

2. Асаблівасці склонавых канчаткаў

2.1. Назоўнікі І, ІІ, ІІІ скланенняў, асаблівасці іх склонавых канчаткаў

2.2. Скланенне назоўнікаў у множным ліку

2.3. Рознаскланяльныя назоўнікі

2.4. Нескланяльныя назоўнікі

2.5. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў

**ІІ. Пытанні да самакантролю ведаў**

**ІІІ. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## I. Тэарэтычны раздзел

### 1. Граматычныя катэгорыі назоўніка

#### 1.1. Катэгорыя роду

Назоўнікі ў форме адзіночнага ліку належаць да аднаго з трох родаў: мужчынскага: *стол, падручнік, сын*; жаночага: *дачка, сяброўка, сукенка*; ніякага: *окно, возера, дзіця.* Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку, катэгорыі роду не маюць (*дрожджы, апілкі, акуляры* ).

Род назоўнікаў можна вызначыць трыма спосабамі: па марфалагічных прыметах, сінтаксічна і семантычна, г.зн. паводле значэння.

Паводле марфалагічных прымет да ***мужчынскага роду*** адносяцца назоўнікі з нулявым канчаткам у назоўным склоне адзіночнага ліку: *мох, лагер, дзень, чай* , а таксама невялікая група асабовых назоўнікаў, якія ў назоўным склоне маюць канчатак *-а(-я):дзядзька — дзядзькі, бацька — бацькі, мужчына — мужчыны*.

Да ***жаночага роду*** належаць назоўнікі, якія ў назоўным склоне маюць канчатак *-а(-я)* і нулявы канчатак, а ў родным — канчатак *-ы(-і):восень – восені, радасць – радасці, далеч – далечы, поўнач – поўначы*.

Да ***ніякага роду*** адносяцца назоўнікі, якія ў назоўным склоне маюць канчаткі *-а(-я), -о(-ё), -е,* а ў родным *а(-я):гумно, галлё, узвышша, імя, поле.*

Сінтаксічна род назоўнікаў вызначаецца па форме дапасаванага слова: *блакітны шалік, блакітнае неба, блакітная далячынь.*

Паводле значэння назвы асоб мужчынскага полу адносяцца да мужчынскага роду: *брат, дзядзька, дзядуля*, а назвы асоб жаночага полу – да жаночага роду: *маці, сястра, дзяўчынка*. Родавыя пары ўтвараюцца суплетыўнымі асновамі: *бацька – маці, сын – дачка, хлопчык – дзяўчынка*, а таксама пры дапамозе суфіксаў: *студэнт – студэнтка, настаўнік – настаўніца.*

Назоўнікі *плакса, сірата, выскачка, няўмека, непаседа* і інш. могуць ужывацца ў значэнні мужчынскага і жаночага роду. Гэта назоўнікі ***агульнага роду***. Ад іх трэба адрозніваць назвы асоб мужчынскага і жаночага полу, што ўказваюць на прафесійны занятак, пасаду і звычайна маюць форму мужчынскага роду: *доктар, інжынер, прафесар, дырэктар*. Граматычна род

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

у такіх выпадках вызначаецца сінтаксічна па дапасаваных словах: *дырэктар Сталярова, рэдактар падпісала.*

Многія назвы жывых істот ужываюцца ў форме толькі мужчынскага або толькі жаночага роду: *вожык, сокал, вавёрка, сініца*. Некаторыя назоўнікі, што абазначаюць жывёл, утвараюць родавыя пары пры дапамозе суплетыўных асноў: *певень – курыца*, або суфіксаў: *кот – кошка*.

**1.2. Несупадзенне роду некаторых аднакарэнных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах**

У беларускай і рускай мовах катэгорыя роду назоўнікаў не заўсёды супадае. Выдзяляюцца дзве групы назоўнікаў, род якіх не супадае:

- назоўнікі з аднолькавай марфемнай будовай у дзвюх мовах, так, словы *сабака, фальш, летапіс, жывапіс, накіп, рукапіс, поступ, дроб, насып, цень, пыл, боль, шынель, мазоль, палын, подпіс* у беларускай мове мужчынскага роду, у рускай — жаночага; назоўнік *гусь* у беларускай мове жаночага роду, у рускай — мужчынскага;
- назоўнікі, у якіх ёсць адрозненне ў марфемнай будове. Напрыклад: *табака, туфля, жырафа, камода, пара, ухаба, цыкорыя, пратока* ў беларускай мове жаночага роду, у рускай *табак, туфель, жыраф, комод, пар, ухаб, цикорий, проток* — мужчынскага роду; *яблык, капыт* у беларускай мове мужчынскага роду, у рускай *яблоко, копыто* — ніякага роду; у беларускай мове *жыццё, жніво, брыво* ніякага роду, у рускай *жизнь, жатва, бровь* — жаночага роду.
- назоўнікі, якія з’яўляюцца назвамі маладых істот у беларускай мове адносяцца да ніякага роду: *кураня, шчаня, кацяня, казляня*, у рускай — да мужчынскага: *цыпленок, щенок, котенок, козленок*.

**1.3. Катэгорыя ліку назоўнікаў**

У сучаснай беларускай мове большасць назоўнікаў мае формы адзіночнага і множнага ліку.

***Лік*** назоўнікаў — гэта граматычная катэгорыя, якая выражае колькасць прадметаў у шэрагу аднародных: *дзень – дні, сад – сады*. Назоўнікі ***адзіночнага ліку*** абазначаюць адзін прадмет: *стол, хвоя , унучка;****множнага*** — мноства аднародных прадметаў: *сталы, хвоі, унучкі*.

Катэгорыю ліку можна вызначыць марфалагічна і сінтаксічна. Марфалагічнымі сродкамі выражэння ліку з’яўляюцца канчаткі: для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзіночнага ліку — канчаткі -*а(-я), -о, -е,нулявы канчатак*: *зямля, парта, акно, поле, стол*; для множнага — канчатак -*ы(-і): землі, парты, вокны, палі, сталы*, канчатак -*е* ўласцівы для невялікай групы назоўнікаў: *гараджанін — гараджане, селянін — сяляне, мінчанін — мінчане* (але: *два гараджаніны, тры селяніны)*. Формы ліку могуць утварацца ад розных (суплетыўных) асноў: *чалавек — людзі*.

Сінтаксічна лік назоўнікаў вызначаецца па форме дапасаванага слова (прыметніка, парадкавага лічэбніка, некаторых разрадаў займеннікаў, дзеепрыметніка) або выказніка, выражанага дзеясловам: *маё першае ўражанне – мае першыя ўражанні, новае паліто – новыя паліто*. Менавіта сінтаксічны сродак (дапасаванае азначэнне і выказнік) з'яўляецца адзіным паказчыкам ліку для нескланяльных назоўнікаў іншамоўнага паходжання: *спрытны кенгуру — спрытныя кенгуру, прыляцеў какаду – прыляцелі какаду.*

Большасць назоўнікаў беларускай мовы маюць дзве формы ліку — адзіночнага і множнага. Аднак некаторыя назоўнікі не маюць суадносных форм адзіночнага і множнага ліку, г.зн. маюць або толькі адзіночны, або толькі множны лік. Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, называюцца ***адзіночналікавымі.*** Да іх адносяцца:

- рэчыўныя: *чарніла, алюміній, масла*;
- зборныя: *студэнцтва, птаства, апаратура*;
- абстрактныя: *сумленне, памяць, дабрыня*;
- назвы формаў дзяржаўнага і грамадскага ладу, плыняў мастацтва: *феадалізм, сюрэалізм*;
- назвы напрамкаў свету: *поўнач, поўдзень, усход, захад*;
- назвы месяцаў: *ліпень, жнівень, верасень*;
- уласныя імёны: *Францыск Скарына, плошча Незалежнасці, Мінск*.

Назоўнікі, якія маюць катэгорыю толькі множнага ліку, называюцца ***множналікавыя***. Да множналікавых належаць назоўнікі, якія абазначаюць:

- канкрэтныя прадметы, што складаюцца з дзвюх або некалькіх аднолькавых частак: *дзверы, грудзі, акуляры;*
- рэчывы, прадукты, адыходы вытворчасці: *дрожджы, духі, памыі, апілкі;*
- народныя звычаі: *вячоркі, пярэзвы, заручыны;*
- гульні: *хованкі, жмуркі, фанты, шахматы*;
- грамадскія прадэсы, дзеянні: *перагаворы*, *зносіны, выбары;*
- прыродныя з'явы, адрэзкі часу: *замаразкі, канікулы, суткі;*
- геаграфічныя назвы: *Крупкі, Курапаты, Шабаны*

З а ў в а г а. Старажытная беларуская мова выкарыстоўвала тры формы ліку: адзіночны, множны і парны. Форма парнага ліку ўжывалася пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абазначэнні парных прадметаў: *бока, руці, нозе, рога* і калі гаворка ішла пра два прадметы: *оба брата, дъва стола, дъві стЬнЬ*. У працэсе развіцця мовы, пачынаючы з ХШ ст., парны лік выцясняўся множным лікам. У сучаснай беларускай мове захаваліся толькі рэшткі былой формы творнага склону парнага ліку *плячыма, вачыма, дзвярыма,* якія ўжываюцца паралельна з формамі множлага ліку *плячамі, вачамі, дзвярамі.*

### 1.4. Несупадзенне ліку некаторых аднакарэнных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах

Катэгорыя ліку некаторых аднакарэнных назоўнікаўу беларускай і рускай мовах не заўсёды супадае. Напрыклад,урускай мовеназоўнік *бобы* мае толькі форму мн. ліку, а ў беларускай -- *боб* адзіночнага ліку; назоўнік *грудь* можа ўжывацца ў рускай мове як у адзіночным, так і у множным ліку, а ў беларускай мове – *грудзі* мае толькі форму мн. ліку; *дверь* у рускай мове мае катэгорыю адзіночнага ліку, а ў беларускай – толькі форму мн. ліку *дзверы*; *двойня* у рускай мове – адзіночны лік, у беларускай – *двайняты* мае толькі форму мн. ліку; *конопля* у рускай мове мае толькі форму адз .ліку, а ў беларускай назоўнік *каноплі* мае толькі форму мн. ліку; рускі назоўнік *монисто* ўжываецца ў адзіночным ліку, беларускі *маністы* мае толькі форму мн. ліку; *поведение* ў рускай мове мае толькі форму адз. ліку, а ў беларускай *паводзіны* мае толькі форму мн. ліку; рускі назоўнік *пригоршня* ўжываецца ў адзіночным ліку, а беларускі *прыгаршчы* мае толькі форму мн. ліку; *яровые* ў рускай мовемае толькі форму множнага ліку, а ў беларускай *ярына* адз. ліку. Даволі шырока ў беларускай мове для абазначэння множнасці прадметаў выкарыстоўваюцца зборныя назоўнікі, якім няма адпаведнікаў у рускай мове, напрыклад: *бярвенне, валоссе, зуб’е, пер’е, лісце, карэнне* і г.д.

### 1.5. Катогорыя склону назоўнікаў. Сістэма склонаў у сучаснай беларускай мове

У сказах і словазлучэннях назоўнікі звязваюцца з іншымі словамі. Пры гэтым яны змяняюць свае канчаткі па склонах. Граматычная катэгорыя склону выражае адносіны да іншых слоў у словазлучэннях і сказах. Такім чынам, ***склон*** — граматычная катэгорыя, якая паказвае адносіны назоўніка да іншых слоў у словазлучэннях і сказах. У сучаснай беларускай мове шэсць склонаў:

- назоўны (адказвае на пытанні х т о?, ш т о?);
- родны (к а г о?, ч а г о?);
- давальны (к а м у?, ч а м у?);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- вінавальны (к а г о?, ш т о?);
- творны (к і м?, ч ы м?);
- месны (п а кім?, н а ч ы м?, у ч ы м?).

**1.6. Роля прыназоўнікаў пры выражэнні склонавых значэнняў**

Назоўны склон называецца ***прамым***, астатнія — ***ускоснымі***. У сучаснай беларускай мове назоўны склон ніколі не ўжываецца з прыназоўнікамі, а месны, наадварот, толькі з прыназоўнікамі. Усе астатнія склоны могуць ужывацца як з прыназоўнікамі, так і без іх. У сказе ці ў словазлучэнні прыназоўнікі ўдакладняюць значэнне склонавай формы (параўн.: чытаць да ночы (часавае значэнне), даехаць да горада (прасторавае значэнне), пашана да бацькоў (аб'ектнае значэнне). Форма назоўнага склону адзіночнага ліку з'яўляецца пачатковай формай назоўніка.

Старажытная беларуская мова мела сёмы склон — ***клічны***. У сучаснай беларускай мове формай клічнага склону выражаецца зваротак: *Кінь, хлопча, мары сніць* (К-с).

**1.7. Асноўныя значэнні склонаў**

***Назоўны*** склон абазначае суб'ект дзеяння, выконвае функцыю дзейніка двухсастаўнога сказа і галоўнага члена намінатыўнага сказа: *Узлессе. Ціхі ранак. Зямля дыхае ласкай і цеплынёй* (Лыньк.). У так званых пасіўных канструкцыях назоўнік назоўнага склону можа абазначаць прадмет, на які накіравана дзеянне: *Дарога сціскаецца лесам і спускаецца ў лагчыну, потым ізноў падымаецца на горку* (К-с). *Хмара нібы расшчапілася маланкай, прагучаў магутны ўдар грому* (Хадк.).

Назоўны склон часта ўжываецца ў ролі выказніка: *Палессе – край легендаў і паданняў (Сач.)*; прыдатка: *Падаюць сняжынкі – дыяменты-росы…(Тр.)*; зваротка: *Адышло ад нас ты, лета, жаўталісцем лес адзеты* (К-с).

Кожны ўскосны склон ужываецца з пэўным значэннем:

***Родны*** склон можа абазначаць:

- частку ад цэлага: *глыток вады, літр малака, вугал стала*;
- аб’ект дзеяння: *напісанне дыктанта, уборка сена*;
- аб'ект пры адмаўленым дзеянні: *не выкапаць бульбы, не вывучыць верша*;
- адносіны асобы, прадмета да іншай асобы, прадмета: *сябар сям’і, выхавацель групы*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- аб’ект часовага карыстання: *папрасіць ключа, пазычыць грошай;*
- прыналежнасць: *цацка дзіцяці, словы дачкі*;
- азначальнае значэнне: *тэма выступлення, успаміны дзяцінства*;
- часавае значэнне: *працаваць з раніцы, чакаць да вечара*;
- прастаравае значэнне: *стаяць каля дарогі, пайсці ад лесу*;
- значэнне мэты: *жыць для дзяцей, падрыхтавацца да заняткаў*;
- значэнне прычыны: *смяяцца ад радасці, плакаць з гора*.

***Давальны*** склон абазначае:

- ускосны суб’ект: *дзіцяці не спіцца*; *быць удзячным бацькам*;

- адрасат, на які накіравана дзеянне: *дзякаваць настаўнікам, усміхацца малому*.

***Вінавальны*** склон абазначае:

- прамы аб'ект: *любіць дзяцей*, *пісацьдыктоўку;*

- прадмет думкі, пачуцця, мовы: *думаць пра маці, клапаціцца пра старэйшых*;

- час: *працаваць дзень і ноч*;

- мэту: *ісці ў грыбы, пайсці ў ягады*;

- прастору: *накіравацца ў школу, пабегчы на пляцоўку*.

***Творны*** склон абазначае:

- прыладу, прадмет дзеяння: *пісаць алоўкам, зрэзаць нажом*;
- ускосны суб'ект: *пахне сенам, павеяла водарам*;
- сумеснасць: *бацька з сынам, выхавацель з дзецьмі*;
- час: *чытаць вечарамі, прагулка ціхім ранкам*;
- прастору: *стаяць за дубам, ісці лесам*;
- спосаб дзеяння і параўнання: *гаварыць басам, ісці ланцужком.*

***Месны*** склон абазначае:

- месца дзеяння: *працаваць на полі, жыць у вёсцы*;
- прычыну: *нагаварыць са злосці, памыліцца па маладосці*;
- аб'ект: *дагавор аб супрацоўніцтве, закон аб адукацыі*;
- стану: *быць у роспачы, застыць у здзіўленні, зайсціся ў плачы*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1.8. Скланенне назоўнікаў. Тыпы скланення назоўнікаў

***Скланенне*** -- гэта змяненне назоўнікаў па склонах у адзіночным і множным ліку.

У залежнасці ад склонавых канчаткаў і роду назоўнікі падзяляюцца на тры тыпы скланення: першае, другое і трэцяе. Тып скланення вызначаецца па назоўным склоне адзіночнага ліку з улікам катэгорыі роду назоўніка.

Да п е р ш а г а скланення адносяцца назоўнікі жаночага роду з канчаткам -*а(-я)*: *краіна, рака, зямля.*

Да д р у г о г а скланення адносяцца назоўнікі мужчынскага роду з нулявым канчаткам: *дзень, горад, верабей*; усе назоўнікі ніякага роду з канчаткамі -*о(-ё), -е, -а:акно, возера, жыццё, поле,* у тым ліку пяць назоўнікаў на -*мя: полымя, бярэмя, цемя, вымя, семя.*

Да т р э ц я г а скланення адносяцца назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам: *радасць, печ, любоў*.

Не ўваходзяць ні ў адзін тып скланення:

а) рознаскланяльныя назоўнікі : *імя, племя, кацяня, бацька*;

б) нескланяльныя назоўнікі: *дэпо, таксі*;

в) субстантываваныя прыметнікі: *хворая, насякомае*;

г) назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку: *акуляры, вароты.*

Склонавыя канчаткі назоўнікаў залежаць ад асновы слова, якая вызначаецца па апошнім зычным гуку. Аснова назоўнікаў можа заканчвацца:

- на цвёрды зычны: *стол, краіна*;
- на мяккі зычны: *песня, дзень;*
- на зацвярдзелыя зычныя *ж, ш, ч, дж, р, ц: мяжа, плашч, мора;*
- на заднеязычныя *г, к, х: нага, казка, гарох*.

Склонавыя канчаткі могуць залежаць таксама ад націску: *кніг-**ай**, рук-**ой***; лексічнага значэння: *бочка з дуб**у** – верхавіна дуб**а***.

Пры скланенні назоўнікаў могуць змяняцца не толькі канчаткі, але і аснова ў выніку чаргавання галосных або зычных: *сон — сну, рака — на рацэ.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2. Асаблівасці склонавых канчаткаў

### 2.1. Назоўнікі I, II, III скланенняў, асаблівасці іх склонавых канчанкаў

Назоўнікі п е р ш а г а скланення ў ***родным склоне*** з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ы****: сцяны, гары, сястры, мяжы*; з асновай на мяккі зычны і г, к, х ***-і*** : *песні, зямлі, рукі, страхі.*

У ***давальным і месным склонах*** канчаткі назоўнікаў 1–га скланення аднолькавыя: *-е, -і, -ы, -э*. Канчатак **-е** маюць назоўнікам з асновай на цвёрды зычны і на *г, х*, якія чаргуецца з***з і с****:сцяна – сцяне, (на) сцяне; нага – назе, (на) назе; страха – страсе, (на) страсе.* Канчатак ***-і*** маюць назоўнікі з мяккай асновай: *зямля — зямлі, (у) зямлі, змяя – змяі, (на) змяі.* Канчатак ***-ы***маюць назоўнікі з асновай на зацвярдзелы зычны і на ***к***, які чаргуецца з ***ц,*** прычым націск прыпадае на на аснову: *пушча — пушчы, (у) пушчы, сястра — сястры, (у) сястры, бібліятэ́ка - бібліятэ́цы, (у )бібліятэ́цы;* калі ж аснова заканчваецца на **к**, а націск прыпадае на канчатак – канчатак **-э**: *дачка́ – дачцэ́, (пры) дачцэ́.*

У ***вінавальным склоне*** назоўнікі з асновай на цвёрды, зацвярдзелы і асновай на *г, к, х* маюць канчаткі **–у**: *сцяну, сястру, мяжу*; з асновай на мяккі – канчатак **-ю**: *песню, вішню.*

У ***творным склоне*** назоўнікі з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны маюць пад націскам канчатак **-ой(-ою)**: *ракой (-ою), жняёй (-ёю)*, не пад націскам –ай(-аю): *дарогай (-аю), песняй (-яю).*

У родным склоне назоўнікі д р у г о г а скланення ніякая роду з асновай на цвёрды, зацвярдзелы зычны і на *г, к, х* маюць канчатак –**а**: *сяла, ружжа, сонца, вуха*; пры аснове на мяккі -- **-я:***поля, задання, полымя.*

Назоўнікі мужчынскага роду ў ***родным склоне*** ў залежнасці ад лексічнага значэння маюць канчаткі **-а(-я)** або **-у(-ю).** Канчатак **-а(-я)** маюць назоўнікі, якія абазначаюць:

- асоб, жывых істот: *вучня, суседа, вожыка* (канчатак **-а** маюць таксама назоўнікі *тапелец, нябожчык, мярцвяк)*;
- часткі цела чалавека ці жывёлы: *вуха, мозга, хваста (але: **твару**)*;
- канкрэтныя прадметы: *агурка, алоўка, трактара;*
- арганізацыі, прадпрыемствы, установы: *завода, офіса, універсітэта*;
- спартыўныя гульні, віды спорту: *футбола, хакея, баскетбола;*
- населеныя пункты, геаграфічныя назвы: *горада, хутара, Мінска*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- адзінкі вымярэння, акрэсленыя адрэзкі часу: *ампера, градуса, грама, сантыметра, метра, рубля, дня, тыдня, месяца, года* (але: *з году у год; без году тыдзень*);
- назвы месяцаў і дзён тыдня: *аўторка, панядзелка, чацвярга*;
- назвы грашовых адзінак: *долара, рубля, франка*;
- назвы танцаў і картачных гульняў: *вальса, паланэза, покера, прэферанса;*
- навуковыя тэрміны: *ромба, косінуса, назоўніка, дзеяслова, прэфікса, канчатка, суфікса* (але: ***склону***).

Канчатак -у(-ю) характэрны для назоўнікаў, што абазначаюць:

- зборныя прадметы: *бярэзніку, ельніку, хмызняку, алешніку, пырніку, часнаку, натоўпу, калектыву*;
- рэчывы, хімічныя злучэнні, элементы: *цукру, пяску, снегу, чаю, соку, шакаладу, клею, ёду, кіслароду,* (але: ***хлеба, аўса, бітка, жаўка***);
- з'явы прыроды, стыхійныя бедствы: *ветру, дажджу, туману, грому, галалёду, агню, сухавею, тайфуну*;
- прасторавыя паняцці: *лугу, краю, шляху, небасхілу, нізу, верху*;
- напрамкі ў прасторы: *усходу, захаду* (але: ***поўдня***);
- неарэсленыя прамежкі часу: *моманту, мігу, часу;*
- назвы захворванняў: *апендыцыту, грыпу, каклюшу*;
- абстрактныя паняцці, якасці, дзеянні, стан: *густу, гонару, розуму, спакою, болю, жаху, сораму, смутку, гневу*;
- грамадскія фармацыі, навуковыя плыні, тэорыі: *капіталізму, сацыялізму, дарвінізму, матэрыялізму, ідэалізму, фармалізму, сіянізму, сентыменталізму*;
- падзеі ў жыцці грамадства і чалавека: *рэферэндуму, фэсту, юбілею*.

Як правіла, канчатак **-у(-ю)** уласцівы назоўнікам, якія ўваходзяць у склад устойлівых выразаў: *даць маху, ні роду ні плоду, звесці са свету, час ад часу, ні слыху ні дыху, носу не паказваць, не да смеху, не да твару, ні складу ні ладу, з першага погляду*.

Мнагазначныя словы ў залежнасці ад таго, якое значэнне рэалізуюць у кантэксце, могуць мець канчаткі **-а(-я) і -у(-ю)**: *шмат народу і з гушчы народа; падышоў да пад'езда і няма пад'езду*.

У ***давальным склоне*** назоўнікі 2-га скланення маюць канчатак **-у(-ю)**: *доктару, сонцу, шчасцю*.

Канчаткі ***вінавальнага склону*** назоўнікаў мужчынскага роду залежаць ад адушаўлёнасці і неадушаўлёнасці назоўнікаў. Канчаткі адушаўлёных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

назоўнікаў супадаюць з канчаткамі роднага склону **-а(-я):***брата, выхавацеля, хлопчыка, вераб'я*; неадушаўлёных — з назоўным (нулявы канчатак): *дзень, дуб, яблык*.

У ***творным склоне*** назоўнікі мужчынскага роду з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны, а таксама з асновай на *г, к, х* пад націскам маюць канчатак **-ом**: *арлом, пачуццём*, не пад націскам **-ам**: *стэпам, сцягам*; з асновай на мяккі зычны пад націскам — **-ём**: *вераб'ём, салаўём, агнём*, не пад націскам — **-ем**: *героем, краем, аленем*.

У ***месным склоне*** назоўнікі 2-га скланення ў залежнасці ад асновы і лексічнага значэння могуць мець канчаткі **-е, -і, -ы, -у(-ю).** Канчатак **-е** маюць назоўнікі з цвёрдай асновай, а таксама з асновай на г, х, якія чаргуюцца з **з, с**: *(у) доме, садзе, (на) акне, лузе*. Назоўнікі з мяккай асновай маюць канчатак **-і**: *(на) пні, кані, (у) полі;* з асновай на зацвярдзелы -- **-ы**: *(на) дажджы, (у) гаражы*. Канчатак **–у(-ю)** маюць агульныя і ўласныя назвы асоб: *(пры) сыне, браце*, некаторыя назоўнікі з цвёрдай асновай пад націскам, пры гэтым чаргаванне цвёрдых і мяккіх зычных не адбываецца: *ход — на хаду, лёт — на ляту*, а таксама назоўнікі з асновай на ***к*** і на ***г, х***, якія не чаргуюцца з **з, с**: *зборнік – (у) зборніку, мітынг – (на) мітынгу.*

У ***родным, давальным і месным склонах*** назоўнікі 3-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі. Назоўнікі жаночага роду з асновай на мяккія і губныя зычныя маюць канчатак **-і**: *аповесці, моладзі, любові*; з асновай на зацвярдзелы **-ы**: *ночы, цішы, далечы*.

Канчаткі ***вінавальнага склону*** назоўнікаў супадаюць з канчаткамі ***назоўнага склону*** (нулявы канчатак): *верф, печ, мыш*.

У творным склоне назоўнікі з асновай на зацвярдзелыя зычныя маюць канчатак **–у**; з асновай на мяккія, губныя і *-р* — **-ю**, пры гэтым апошні зычны асновы, калі стаіць паміж галоснымі, падаўжаецца: *плынню, далеччу, любоўю*. Калі аснова заканчваецца на губны зычны (*б,ф*) і *р*, то пасля іх перад канчаткам –**ю** ставіцца апостраф: *верф'ю, Сібір'ю, глыб'ю*.

### 2.2. Скланенне назоўнікаў у множным ліку

Большасць назоўнікаў у множным ліку змяняецца аднолькава: ва ўсіх склонах, за выключэннем роднага, назоўнікі трох скланенняў маюць агульныя канчаткі.

Назоўнікі множнага ліку з цвёрдай і зацвярдзелай асновай у ***назоўным склоне*** маюць канчатак **-ы**: *сталы, дажджы;* з мяккай і асновай на г, к, х **-і**:

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

*дарогі, песні*; з суфіксам -анін(-янін) — **-е:***гараджанін – гараджане, селянін – сяляне.*

***Родны склон*** вызначаецца разнастайнасцю канчаткаў у залежнасці ад тыпу скланення: **-аў(-яў), -оў(-ёў), -ей(-эй)** і **нулявы** канчатак. Назоўнікі **1-га** скланення маюць ***нулявы*** канчатак, калі аснова заканчваецца адным зычным: *хат, кніг, сцен.* Назоўнікі, аснова якіх заканчваецца збегам зычных і падоўжаным зычным, ужываюцца з канчаткам **-аў(-яў)**: *стрэльбаў, гульняў, ваннаў*. Калі ж другі зычны ў аснове гук [к], то ў родным склоне назоўнік мае нулявы канчатак: *думка – думак, шапка – шапак.*

Назоўнікі **2-га** скланення маюць канчаткі **-аў(-яў), -оў(-ёў):***крэслаў, вучняў, палёў;* асобныя назоўнікі -- канчатак **-эй(-ей)**: *плячэй, вачэй, гасцей*.

Назоўнікі **3-га** скланення пад націскам маюць канчатак **-эй(-ей),** не пад націскам **-аў(-яў)**: *мышэй, абласцей, рэчаў, даляў*.

У родным склоне часта ўжываюцца варыянтныя канчаткі: **нулявы** і – **аў(-яў):***меж – межаў, вішань – вішняў, партызан – партызанаў*; **-аў(-яў)** і **–-эй (-ей)**: *печаў – пячэй, сенажацеў – сенажацей*.

У ***давальным склоне*** назоўнікі ўсіх трох скланенняў маюць канчатак **-ам(-ям)**: *садам, землям, вокнам.*

У ***вінавальным склоне*** назоўнікі, якія абазначаюць:

а) неадушаўлёныя прадметы, маюць канчаткі **-і, -ы** ( як у назоўным склоне): *землі, гарады*;

б) назоўнікі, што абазначаюць адушаўлёныя прадметы, — **-аў(-яў), -оў(-ёў), -эй(-ей)** і нулявы канчатак (як у родным склоне): *дзяцей, вучняў, суседзяў.*

У ***творным склоне*** назоўнікі множнага ліку маюць канчаткі:

**-амі(-ямі)**: *сцянамі, вучнямі*;

**-мі**: *коньмі*;

**-ыма**: *вачыма, грашыма*.

Назоўнікі множнага ліку ў ***месным склоне*** маюць канчаткі **-ах(-ях)**: *пры бацьках, на агародах, у групах.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### 2.3. Рознаскланяльныя назоўнікі

Да рознаскланяльных назоўнікаў адносяцца:

- назвы маладых істот: *кураня(-ё), кацяня(-ё), цяля(-ё)*;
- тры назоўнікі на -мя: *імя, племя, стрэмя*;
- назоўнікі мужчынскага роду з ненаціскным канчаткам **-а(-я)** тыпу *мужчына, дзядуля, бацька, дзядзька*;
- назоўнікі агульнага роду, калі яны абазначаюць асоб мужчынскага полу: *забіяка, гарэза, цёзка, ціхоня, плакса, сведка*.

Рознаскланяльныя назоўнікі маюць канчаткі розных тыпаў скланення.

Назоўнікі ніякага роду, што з'яўляюцца назвамі маладых істот, у ***родным, давальным і месным склонах*** набываюць суфікс **-яц-** і змяняюцца, за выключэннем творнага склону, як назоўнікі трэцяга скланення: *дзіцяці, птушаняці, кацяняці.*. У ***творным склоне,*** як і ў назоўным, гэтыя назоўнікі ўжываюцца без суфікса і маюць канчатак другога скланення **-ём**: *птушанём, кацянём, дзіцём (*варыянт: *дзі́цем).* Ва ўсіх ускосных склонах множнага ліку назвы маладых істот, акрамя назоўніка *дзіця*, маюць суфікс **-ят-**: *птушанятам, кацянятам, цялятам.* Назоўнік *дзіця* ў родным склоне множнага ліку мае канчатак **–ей**: *дзяцей*, у творным -- **-мі** : *дзе́цьмі або дзяця́мі.*

Як назвы маладых істот, змяняюцца тры назоўнікі на –мя: *імя, племя, стрэмя,* калі яны ва ўскосных склонах маюць суфікс **–ен-;** у ***родным, давальным і месным склонах*** маюць канчатак **-і**: *імені, племені, стрэмені, па імені, у племені, на стрэмені*. Калі гэтыя назоўнікі змяняюцца без суфікса **-ен-**, то маюць канчаткі назоўнікаў другога скланення з мяккай асновай: *імя, імю, аб імі*:

Н. *імя племя стрэмя*

Р. *імя (імені) племя (племені) стрэмя (стрэмені)*

Д. *імю (імені) племю (племені) стрэмю (стрэмені)*

В. *імя племя стрэмя*

Т. *імем (іменем) племем (племенем) стрэмем (стрэменем*)

М. *у імі (імені) племі (племені) стрэмі (стрэмені)*

У множным ліку назоўнікі *імя, стрэмя* ўжываюцца без суфікса **-ён-** або з ім, а назоўнік *племя* ў множным ліку ўжываецца толькі з суфіксам **-ён-**:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Н. *імі (імёны) стрэмі (страмёны) плямёны*

Р. *імяў (імён, імёнаў) стрэмяў (страмён, плямён, страмёнаў, плямёнаў*)

Д. *імям (імёнам) стрэмям(страмёнам) плямёнам*

В. *імі (імёны) стрэмі (страмёны) плямёны*

Т. *імямі (імёнамі) стрэмямі (страмёнамі) плямёнамі*

М. *у імях (імёнах) стрэмях ( страмёнах ) плямёнах*

Назоўнікі мужчынскага роду на -а(-я) у ***родным і вінавальным склонах*** маюць канчаткі першага скланення: *мужчыны, бацькі, старшыні, мужчыну, бацьку, старшыню*. Канчаткі ***творнага склону*** гэтых назоўнікаў вызначаюцца характарам асновы і націскам: пры аснове на цвёрды яны маюць ненаціскны канчатак **-ам**: *мужчынам, дзядзькам, бацькам* і націскны **-ой(-ою)**: *Кузьмой(-ою), тамадой(-ою);* назоўнікі з мяккай асновай маюць канчаткі **–ем** не пад націскам: *дзядулем, Васем і* **-ёй(-ёю)** пад націскам: *суддзёй(-ёю), старшынёй(-ёю)*. Ад асновы назоўнікаў і націску таксама залежаць канчаткі ***давальнага і меснага склонаў****: мужчыну, (пры) мужчыну, але Кузьме, (пры) Кузьме*. Гэтаксама скланяюцца назоўнікі агульнага роду, калі яны абазначаюць асоб мужчынскага полу: *плакса –плаксу Ваню, плаксам Ванем (але: плаксе Тані, плаксай Таняй)*. Назоўнік *сірата*, незалежна ад таго, асобу якога полу ён абазначае, скланяецца, як назоўнік жаночага роду першага скланення: *сірата, сіраты, сіраце, сірату, сіратой(-ою), пры сіраце*.

### 2.4. Нескланяльныя назоўнікі

У сучаснай беларускай мове ёсць назоўнікі, якія не змяняюцца па склонах і не маюць склонавых канчаткаў. Гэта ***нескланяльныя*** назоўнікі. Да іх адносяцца:

- агульныя назоўнікі іншамоўнага паходжання на галосны: *дэпо, джакузі, кенгуру*;
- уласныя назоўнікі іншамоўнага паходжання на галосны: *Дзідро, Гюго, Дзюма, Баку;*
- славянскія прозвішчы на -о: *Шайко, Скурко, Гурло*;
- жаночыя прозвішчы на зычны: *Атраховіч, Сінюк, Кавалевіч;*
- складанаскарочаныя словы, утвораныя з пачатковых літар: *БДПУ, ВНУ, АТС.*

Склон нескланяльных назоўнікаў вызначаецца сінтаксічна, г.зн. па іх сувязі з іншымі словамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### 2.5. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў

Мужчынскія прозвішчы на *–ін(-ын), -оў(-аў), -еў(-ёў)* скланяюцца як назоўнікі 2-га скланення, толькі ў творным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак **–ым**: *Барысавым, Растовым,* але: *Грынам, Дарвінам, Чаплінам*.

Геаграфічныя назвы з такімі самымі суфіксамі ў творным склоне маюць канчатак –**ам**: *пад горадам Барысавам, Растовам*. У месным склоне прозвішчы маюць канчатак **–у**: *(пры) Мікалаю Барысаву, Растову*, а геаграфічныя назвы -- **-е:***(у) горадзе Барысаве, Растове*.

Прозвішчы на –а(-я-), калі яны належаць асобе мужчынскага полу, у родным і вінавальным склонах маюць канчаткі 1-га скланення, а ў давальным, творным і месным – канчаткі 2-га скланення: Р. *Батуры, Асіпенкі, Ясючэні; Д. Батуру, Асіпенку, Ясючэню; В. Батуру, Асіпенку, Ясючэню;* Т. *Батурам, Асіпенкам, Ясючэнем; М. (пры) Батуру, Асіпенку, Ясючэню.*

Імёны і прозвішчы мужчынскага роду, якія заканчваюцца на зычны, а таксама назоўнікі мужчынскага роду, што абазначаюць геаграфічныя назвы, скланяюцца як агульныя назоўнікі 2-га скланення: *Р. Садовіча Алеся, горада Слуцка; М. (пры) Садовічу Алесю, у горадзе Слуцку*.

Прозвішчы асоб жаночага полу, якія заканчваюцца на зычны, не змяняюцца: *Зосьцы Верас, з Нінаю Колас, Марыі Пашкевіч*.

Не скланяюцца прозвішчы асоб мужчынскага і жаночага полу, якія заканчваюцца на –о: *Гурло, Лапко, Санько*.

### II. Пытанні да самакантролю ведаў

1. Пералічыце марфалагічныя (граматычныя) катэгорыі назоўнікаў.
2. Як вызначаецца катэгорыя роду назоўнікаў?
3. Назавіце спосабы выражэння граматычнай катэгорыі роду назоўніка.
4. Як суадносіцца граматычная катэгорыя роду з біялагічным полам?
5. У якіх назоўнікаў вызначыць род немагчыма?
6. Якія назоўнікі адносяцца да назоўнікаў агульнага роду?
7. Пакажыце на прыкладах функцыянальна-семантычную асаблівасць назоўнікаў агульнага роду.
8. У чым адметнасць вызначэння роду адушаўлёных і неадушаўлёных асабовых і неасабовых нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Прывядзіце прыклады разыходжання роду назоўнікаў у рускай і беларускай мовах і растлумачце, з чым гэта звязана.

10. Што вы ведаеце пра значэнні, спосабы і сродкі выражэння катэгорыі ліку? Прывядзіце прыклады лексічнага, марфалагічнага і сінтаксічнага спосабу выражэння ліку назоўніка.

11. На падставе якіх прымет выдзяляюцца адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі? Ахарактарызуйце семантычныя групы адзіночналікавых і множналікавых назоўнікаў.

12. Праілюструйце прыкладамі адрозненні ва ўтварэнні формаў ліку назоўніка ў беларускай і рускай мовах.

13. Якая граматычная катэгорыя называецца склонам? Якое значэнне ўласціва назоўнаму склону? Якія значэнні маюць ускосныя склоны?

14. Раскажыце пра ролю прыназоўнікаў пры выражэнні склонавых канчаткаў.

15. Назавіце тыпы скланення назоўнікаў. Ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў?

16. Ахарактарызуйце склонавыя канчаткі назоўнікаў I скланення ў давальным і месным склонах.

17. Ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў II скланення мужчынскага роду ў родным склоне? Прывядзіце прыклады.

18. Ахарактарызуйце склонавыя канчаткі назорўнікаў III скланення.

19. Якія назоўнікі адносяцца да рознаскланяльных? Як яны скланяюцца?

20. Якія асаблівасці скланення назоўнікаў у множным ліку?

21. Якія назоўнікі адносяцца данескланяльных?

22. Раскажыце пра скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.

23. Якія спосабы словаўтварэння характэрны для назоўнікаў?

24. Як пішуцца складаныя назоўнікі?

25. Ахарактарызуйце тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў назоўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## III. Практычнаыя заданні

**Заданне 1. Вызначце род назоўнікаў, абгрунтуйце выбар. Падбярыце да іх прыметнікі і запішыце ўтвораныя словазлучэнні.**

ААН, авеню, авечка, англічанка, асоба, аташэ, ахапак, балерына, баран, бізнес-ледзі, вавёрчаня, ваяка, Вэрдзі, Гродна, грузчык, жар-птушка, івасі, інкогніта, інтэрв’ю, інтэрнэт-кафэ, кальрабі, Карпаты, кацяня, крыло, лад,

МАЗ, машыністка, маянэз, муляр, неба, недарэка, Нёман, пакой, папера, плакса, прайс-ліст, прэс-бюро, раніца, рэктар, рэфарматар, соня, сузор’е, таксі, Тбілісі, трыо, туляга, форс-мажор, француз, хваля, ціхоня, шахцёр, шымпанзэ.

**Заданне 2. Вызначце, якім спосабам (лексічна, марфалагічна, сінтаксічна ці адным з членаў састаўнога наймення) выражаецца значэнне жаночага полу.**

Курыца, Валянціна, самка вожыка, бабуля, практыкантка-арнітолаг, кенгуру задрамала, лісіца, карова, жанчына-ўрач, місіс, ласіха, мадонна, ваўчыца, індычка, кабета, рабыня, дама, самка крумкача, піяністка, Сцепаніда, прыйшла біёлаг, дзяўчына

**Заданне 3. Падбярыце прыметнікі да прапанаваных назоўнікаў.**

Камюніке, рэзюме, кашнэ, Бізэ, безэ, Гідальга, какаду, папуры, бурыме, Батумі, мецца, жалюзі, Жуліа, грызлі, Осла, куцюр’е, Сочы, індыга, По (пісьменнік), інжэню, ватэрпола, фламінга, суахілі, івасі, крупье, бістро, Перу, Чад (возера), жако, джакузі, пенснэ, вета, бенгалі, эфендзі, рэзюме, тарнада, клішэ, калібры, Кіліманджара, манпансье, Элен, кюрэ, кайнэ, янкі, камюніке, пані, Мэры, леча, марабу, Чыкага, ларгета, Чыкага, табу, беры-беры, капрычыа, экю, фрау, Антарыа (правінцыя), Каларада (рака)

**Заданне 4. Запішыце беларускія адпаведнікі да рускамоўных назоўнікаў, вызначце адрозненні ў ліку ці родзе.**

Белила, белье, бровь, гвоздика, дверь, дрожь, зал, калитка, комод, копыто, коромысло, кофе, кружево, крупа, лекарство, летопись, медаль, объявление, общение, овощи, отношение, полынь, поросенок, потолок, россыпь, свет, сливки, стебель, сумерки, табак, щавель, щука, яблоко.

**Заданне 5. Вызначце род абрэвіятур.**

РАУС, БТ, аргаддзел, РТС, спецвопратка, камбат, ЦУМ, ЦЭЦ, БДУ, ЭВМ, біяфак, СНТ, АТС, аргработа, прафорг, ЖЭК, БелЭН, ЖЭУ, ТСБМ, ЕС, ВКЛ, НАН, спецкурс, камроты, БелАМ, ЦСУ, медсястра, ЭліМБел, ГУУС, нарсуд, НЗ, БАМ, ГЭС, камандарм, БРС, БелТА, БНТУ, ДАІ, Белтрансгаз, ТБМ, СП, дот, БРСМ, КНР, ВМФ, Мінэканомікі, Белофістэхніка, МАЗ, ФІФА, Цэнтрвыбарком

**Заданне 6. Вызначце, якія назоўнікі ўжываюцца ў адзіночным і множным ліку, толькі ў адзіночным ліку, толькі ў множным ліку.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Духі, хованкі, малако, соль, дзёгаць, вілы (прылада працы), спрыт, грудзі, Дзяды (свята), правады, біткі, нябёсы, крылы, дзверы, дзяды, рыззё, крупы, вілы (загарадныя дамы), яснасць, блізняты, гваздзікі, яравізацыя, провады, газа, агентура, вараннё, Бялевічы (вёска), Еўропа, проса, вада.

**Заданне 7. Спішыце словазлучэнні, паставіўшы назоўнікі ў дужках у патрэбнай склонавай форме. Растлумачце правапіс канчаткаў, зыходзячы з тыпу асновы і скланення.**

Аддаць гасцінец (*дзіця, Каця*), быць на (*від*), быць на судзе (*абвінаваўца, суддзя*), весці гутарку аб (*народ, чалавек*), выйсці з (*парк, універсітэт*), гаварыць аб (*Саша Чарнова, Саша Чарноў*), галіны (*вішні*), ганарыцца (*бацька, маці*), жыць пры (*муж, сын*), заліты (*кроў*), застацца пры (*дачка Таня, Таццяна*), звіць гняздо на (*дуб*), кавалак (*хлеб*), каля цёмнага (*лес*), клубы (*снег*), кіраваць (*верф*), колер (*арнамент*), многа (*дарогі*), мэбля з (*дуб*), на высокай (*гара, сасна*), на лясной (*сцежка*), на нізкай (*хвоя*), на прыгожай (*ружа*), на самай (*страха*), на старонках (*кнігі*), на суседняй (*мяжа*), недахоп (*калій*), не чуваць (*вецер*), пад засень (*ліпы*), парывы (*дождж*), па дзіцячай (*шчака*), па ўхабістай (*дарога*), перыяд (*заняпад*), песня (*бусел*), піск (*парася*), плаваць у (*возера, малако*), плошча (*горад*), пры сваёй (*сястра, сястрычка*), прысутнічаць на (*мітынг*), рамонт з (*гарантыя*), сказаць (*дзядуля, мужчына*), слухаць з (*цікавасць*), схавацца за чужымі (*плечы*), сустрэцца (*ноч*), у глыбокай (вада), у малой (*рака, рэчка*), у матчынай (*рука*), у новай (*машына*), у рупнай (*праца*), у самай (*душа*), укладка (*асфальт*), успаміны аб (*Іван Мележ*), у цёплай (*лазня*), у шкляным (*слоік*), хлопец з чорнымі (*вочы*), шапачка (*грыб*).

**8. Дапішыце канчаткі склонавых формаў назоўнікаў і растлумачце іх. Зрабіце марфалагічны разбор назоўнікаў з трох першых сказаў.**

На першым заходз.. атака абарвалася. Ахапіўшы падков.. вышын.., рота спрабавала ўварвацца ў траншэ.. на самай вышын.., але не дайшла нават да палавін.. схіл.. . Шквальны агонь нямецкіх кулямёт.. паклаў аўтаматчык.. на голым, умерзлым ад ранішняга мароз.. палетк.., і так, нейкі час паляжаўшы на ветр.., яны прабежкамі вярнуліся туды, адкуль пачыналі. Гэта быў глыбокі, голы, без куст.., роў з рэдкімі плям.. яшчэ не расталага снег.. і з замёрзлым руча.. пасярэдзіне; ён хаваў ад агн.., ад неаслабнага напор.. сцюдзёнага сакавіцкага ветр.. і вызначаўся магчымасц.. вырашыць, што рабіць далей. Трохі аддыхаўшыся на яго зацішным ад кул.. бак.., ротны паклікаў абодвух сваіх камандзір.. узвод.. . (В.Быкаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ